# § 16. Вызваленне БССР ад германскіх захопнікаў. Унёсак беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй. Удзел БССР у заснаванні ААН

***Успомніце.*** Узгадайце прозвішча камандуючага 2-й рускай арміяй, якая вяла баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў час вайны 1812 г.

***Вучэбная задача.*** Вызначыць унёсак беларусаў у перамогу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і захаванне міру.

**Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён».** Восенню 1943 г. Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Беларусі. У выніку наступлення былі вызвалены два абласныя цэнтры: Гомель і Мазыр.

У чэрвені 1944 г. пачалася Беларуская наступальная **аперацыя «Баграціён»**. Яе план заключаўся ў наступным. Войскі Чырвонай Арміі, выкарыстоўваючы дапамогу партызан і мясцовых жыхароў, аднachасова пераходзяць у наступленне на віцебскім, аршанскім і бабруйскім напрамках і магутнымі ўдарамі разбураюць абарону праціўніка. Затым яны ліквідуюць групоўкі ворага ў раёнах Віцебска і Бабруйска і наносяць удары на мінскім напрамку з мэтай акружэння і знішчэння войскаў праціўніка ў так званых «катлах».

Наступленне савецкіх войскаў было нечаканым для ворага. Германскае камандаванне меркавала, што яно адбудзецца на тэрыторыі Украіны. Аднак аперацыя пачалася менавіта ў Беларусі, дзе былі цяжкапраходныя балоты і лясы. Прайсці іх байцам Чырвонай Арміі дапамагалі мясцовыя жыхары і партызаны. Ужо на трэці дзень баявых дзеянняў быў вызвалены Віцебск, на чацвёрты — Орша. Разгарнуліся баі на мінскім напрамку.

Разам з Чырвонай Арміяй у наступальных баях удзельнічалі салдаты і афіцэры 1-й польскай пяхотнай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі. Яна была сфарміравана на тэрыторыі СССР па ініцыятыве Саюза польскіх патрыётаў. Гераічны шлях дывізіі пачаўся ў кастрычніку 1943 г. у бітве каля вёскі Леніна (недалёка ад Горак Магілёўскай вобласці). Цяпер там створаны музей савецка-польскай баявой садружнасці. Траім удзельнікам той бітвы было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.




Эмблема авіяпалка «Нармандыя — Нёман»

У вызваленні Беларусі ўдзельнічалі лётчыкі-добраахвотнікі французскага знішчальнага авіяпалка «Нармандыя — Нёман». Нармандыя — гэта французская правінцыя, якая найбольш пацярпела ад германскай акупацыі, а другая частка назвы палка звязана з удзелам у баях каля Нёмана. На падораных ім савецкіх самалётах французскія лётчыкі летам 1945 г. вярнуліся на радзіму. Чатыры з іх былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. У 2018 г. указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь апошні з жывых байцоў палка



Правообладатель Издательский центр БГУ

(авіямеханік) узнагароджаны ордэнам Пашаны за значны асабісты ўнёсак у вызваленне Беларусі, справу ўмацавання міру, сяброўскіх адносін і адзінства народаў Беларусі і Францыі.




Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён» (23 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г.)

**1.** *Пералічыце з апорай на картасхему назвы франтоў, якія ўдзельнічалі ў аперацыі «Баграціён», і яе этапы.*
**2.** *Знайдзіце на картасхеме так званыя «катлы».*

Правообладатель Издательский центр БГУ

**3 ліпеня 1944 г.** быў вызвалены Мінск.

У складзе танкавага ўзвода вызваляў Мінск ураджэнец Веліжскага павета Віцебскай губерні (цяпер Смаленская вобласць, Расія) **Ігнат Пятровіч Антонаў** (1922—2015). У Вялікую Айчынную вайну ён служыў ваенным фельчарам танкавага батальёна. Дапамагаў параненым у час Сталінградскай бітвы, у баях пад Прохараўкай і Курскам. Пры вызваленні Мінска варожы снарад трапіў у яго танк. Пасля цяжкага ранення І. П. Антонаў вярнуўся на фронт. За гады вайны ён выратаваў 128 параненых воінаў. У пасляваенны час скончыў Мінскі медыцынскі інстытут. Яму першаму прысвоена званне народнага ўрача Беларусі. Ён стаў ганаровым грамадзянінам Мінска і Віцебска. Галоўным у яго жыцці была дапамога людзям. Міжнародны біяграфічны цэнтр у Кембрыджы залічыў І. П. Антонава ў спіс выбітных людзей XX ст.



І. П. Антонаў з жонкай. Пасляваенны фотаздымак

На ўсходзе і паўднёвым усходзе ад Мінска было завершана акружэнне больш як 100-тысячнай групоўкі войскаў праціўніка. У ходзе далейшага наступлення Чырвоная Армія 28 ліпеня вызваліла Брэст. Германскія захопнікі былі выгнаны з беларускай зямлі.

16 ліпеня 1944 г. у Мінску адбыўся партызанскі парад, прысвечаны вызваленню сталіцы. А на наступны дзень быў арганізаваны парад у Маскве — «парад ганьбы» тых, хто жадаў зняволіць Савецкую краіну: па вуліцы Горкага прайшлі калоны германскіх ваеннапалонных, захопленых у час баёў пад Мінскам.



Партызанскі парад у Мінску. 1944 г.



«Парад ганьбы» ў Маскве. 1944 г.

*З апорай на фотаздымкі параўнайце два парады. План параўнання складзіце самастойна. Дзеля чаго, на вашу думку, былі праведзены гэтыя парады?*



Правообладатель Издательский центр БГУ




Мемарыяльны комплекс «Аперацыя „Баграціён“» у Светлагорскім раёне Гомельскай вобласці



Мемарыяльны комплекс «Курган Славы» ў Смалявіцкім раёне Мінскай вобласці

У пасляваенны час на 21-м кіламетры шашы Мінск — Масква быў збудаваны велічны Курган Славы ў гонар воінаў чатырох франтоў, якія вызвалялі Беларусь. У тым месцы, дзе пачыналася наступальная аперацыя «Баграціён» (вёска Ракавічы Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці), адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяла.

**Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.** На франтах Вялікай Айчыннай вайны змагаліся 1 млн 300 тыс. беларусаў.

Пры абароне Ленінграда ў жніўні 1941 г. ураджэнец Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Дубровенскі раён Віцебскай вобласці) наводчык танкавай гарматы **Андрэй Усаў** у адным баі снайперскім агнём асабіста падбіў 22 танкі праціўніка. Гэта адзінкавы выпадак у гісторыі. Тады ж у вежу яго танка трапіла больш за сто варожых снарадаў. А. М. Усаў на працягу Вялікай Айчыннай вайны тройчы гарэў у танку і тройчы быў цяжка паранены. Пасля вайны яму было прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Ленінграда. Ён жыў і працаваў у Талочыне на роднай Віцебшчыне.



А. М. Усаў і З. Р. Калабанаў

У тым баі камандаваў танкавым экіпажам **Зіновій Калабанаў**. У пасляваенны час ён служыў у Беларусі, а пасля звальнення з арміі жыў у Мінску і працаваў на аўтамабільным заводзе. Адна з самых прэстыжных узнагарод у сучаснай камп’ютарнай гульні «World of Tanks» называецца «медалём Калабанава». Ёю ўзнагароджваецца той, хто апошнім са сваёй каманды застаецца ў жывых і атрымлівае перамогу ў баі супраць пяці і больш танкаў праціўніка.

*Растлумачце, у чым заключаецца гістарычная пераемнасць гульні «World of Tanks».*

Правообладатель Издательский центр БГУ

У баях за Дняпро вылучыўся ўраджэнец Горацкага павета Смаленскай губерні (цяпер Горацкі раён Магілёўскай вобласці) **Рыгор Дольнікаў**. У час аднаго з паветраных баёў 20-гадовы лётчык тараніў фашысцкі самалёт, але быў падбіты. Ён трапіў у варожы палон, дзе назваўся прозвішчам Сакалоў. Літаратуразнаўцы мяркуюць, што гісторыя, якая здарылася з ім у палоне, натхніла савецкага пісьменніка Міхаіла Шолахава на стварэнне зборнага вобраза савецкага ваеннапалоннага Андрэя Сакалова ў апавяданні «Лёс чалавека». Згодна з сюжэтам камендант лагера выклікаў Сакалова да сябе, каб зрабіць яму вялікі гонар — расстраляць асабіста. Камендант прапанаваў Сакалову выпіць перад смерцю шклянку шнапсу за перамогу германскай зброі, але той адмовіўся. Тады яму было загадана выпіць за ўласную пагібель. Герой твора выпіў за сваё збавенне ад пакут не закусваючы. Немец прапанаваў другую шклянку. Сакалоў сказаў, што і пасля другой не закусвае. Тады камендант наліў трэцюю шклянку. Выпіўшы яе, Сакалоў пажадаў паказаць ворагам, што, нягледзячы на голад, не збіраецца прымаць іх падачку, бо ў яго ёсць свая годнасць. Здзіўлены такімі паводзінамі савецкага ваеннапалоннага, камендант прызнаў яго адважным рускім салдатам, якога ён паважае як годнага праціўніка і расстрэльваць не будзе. У «сапраўднага» Сакалова — Р. Дольнікава — з трэцяй спробы атрымалася ўцячы з палону, пасля чаго ён працягваў ваяваць з ворагам.



Р. У. Дольнікаў

*1. У чым заключалася сіла характару Р. Дольнікава?*
*2. Паглядзіце кінастужку «Лёс чалавека». Якія пачуцці яна ў вас выклікае?*

У баях на тэрыторыі Латвіі закрыў сваім целам страляючы кулямёт ураджэнец Міншчыны Пётр Купрыянаў, якому ў 1945 г. пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Ён быў малодшым сынам Настассі Фамінічны Купрыянавай. Яшчэ чацвёра яе сыноў удзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне. Сёння ў горадзе Жодзіна створаны манумент у гонар маці-патрыёткі.



Манумент у гонар маці-патрыёткі ў горадзе Жодзіна



Правообладатель Издательский центр БГУ

Шырока вядомым на ўсіх франтах стала імя полацкай дзяўчыны — медсястры **Зінаіды Тусналобавай-Марчанка**.

За восем месяцаў З. Тусналобава-Марчанка вынесла з поля бою 123 параненых. Цудам застаўшыся ў жывых пасля ранення і абмаражэння, яна перанесла восем аперацый, страціла рукі і ногі. Для Зінаіды настала самае цяжкае выпрабаванне: навучыцца жыць у тым стане, у якім яна апынулася. Са шпіталя Зінаіда адправіла напісаны медсястрой пад яе дыктоўку ліст да каханага. На фотаздымку ўнізе вы можаце ўбачыць гэты трохкутнік (так называлі франтавыя лісты, бо іх складалі такім чынам, што атрымліваўся трохкутнік) і прачытаць яго. Будучы муж напісаў у адказ Зінаідзе: «Мілая мая малышка! Родная мая пакутніца! Ніякія няшчасці і беды не змогуць нас разлучыць. Няма такога гора, няма такіх пакут, якія б прымусілі забыцца пра цябе, мая каханая». Гэтыя радкі надалі дзяўчыне сіл для далейшага лячэння і пратэзавання. Усё яе жыццё стала подзвігам, яна ізноў навучылася хадзіць і пісаць, нарадзіла дзяцей. Ёй было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У знак прызнання выключных прафесійных якасцяў, праяўленых пры аказанні дапамогі параненым і хворым, Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа прысудзіў ёй найвышэйшую ўзнагароду — медаль імя Флорэнс Найтынгейл.



З. М. Тусналобава-Марчанка ў шпіталі

*Што выклікае ў вас павагу ва ўзаемаадносінах З. Тусналобавай-Марчанка з яе будучым мужам?*



Полевая почта
№ 03124
Марченко Иосифу
г. Свердловск
Эвакогоспиталь 3861
Тусналобова З. М.

Апрель 1943 г.

Мой дорогой Иосиф!

Не знаю, где и при каких обстоятельствах найдёт тебя мое письмо. Пишу все, как есть, ничего не утаивая. Обманывать, ты же знаешь, я никогда не умела. Со мной стряслась непоправимая беда. Я потеряла руки и ноги. Горько и обидно остаться в 23 года инвалидом... Видимо, моя песенка спета. Будь свободным, родной. Поступай, как сочтешь удобным для себя. Не могу, не имею права стать преградой на твоем пути. Устраивай свою жизнь. Прощай...

Ліст З. М. Тусналобавай-Марчанка, напісаны ў шпіталі

Мужна змагаліся беларусы на франтах Другой сусветнай вайны. Ураджэнцы Заходняй Беларусі служылі ў Польскім корпусе генерала У. Андэрса, які быў сфарміраваны ў 1941—1942 гг. на тэрыторыі СССР з польскіх грамадзян, высланых пасля 1939 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

з Заходняй Беларусі ў Сібір і Казахстан. У складзе брытанскай арміі корпус удзельнічаў у бітве пры Монтэ-Касіна ў Італіі. Гэта была серыя з чатырох кровапралітных баёў, у выніку якіх войскі антыгітлераўскай кааліцыі прарвалі лінію варожых умацаванняў і авалодалі Рымам.

**Уключэнне БССР у склад краін — заснавальніц ААН.** У красавіку 1945 г. на міжнароднай канферэнцыі ў Сан-Францыска было прынята рашэнне аб уключэнні БССР і УССР у лік краін — заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). Гэтым прызнаваліся вялікі ўнёсак Савецкіх Беларусі і Украіны ў разгром нацызму, панесеныя імі ў ходзе вайны каласальныя людскія ахвяры і матэрыяльныя страты.

На канферэнцыю была накіравана дэлегацыя на чале з народным камісарам замежных спраў БССР К. В. Кісялёвым. **26 чэрвеня 1945 г.** з удзелам беларускай дэлегацыі адбылося падпісанне Статута ААН. Па яе прапанове ў 1946 г. была прынята рэзалюцыя ААН «Аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў».

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны па ўмовах Дагавора паміж СССР і Польшчай аб дзяржаўнай граніцы ў жніўні 1945 г. Польшчы былі перададзены 15 раёнаў Беластоцкай і тры раёны Брэсцкай абласцей. Усталявалася мяжа, якая існуе і па сённяшні дзень.

**9 мая 1945 г.** стала Днём Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэты дзень адзначаецца ў Рэспубліцы Беларусь як дзяржаўнае свята. Беларусы праявілі патрыятызм, мужнасць і самаахвярнасць. 449 ураджэнцаў Беларусі ўдастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза, а 73 сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы. Гэта перамога дасталася народам Савецкага Саюза дарагой цаной. Загінула больш за 27 млн савецкіх людзей. Толькі на тэрыторыі Беларусі захопнікі расстралялі, закатавалі, павесілі, спалілі жывымі, знішчылі ў газавых камерах больш за 2,2 млн чалавек. Паводле ўдакладненых звестак, людскія страты Беларусі склалі не менш за 2,8—3 млн чалавек, г. зн. загінуў кожны трэці беларус. Трэба заўсёды памятаць пра тых, хто аддаў сваё жыццё ў барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай краіны.

***Новыя паняцці і тэрміны**: аперацыя «Баграціён».*

1. Дакажыце, што вызваленне БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў мела інтэрнацыянальны характар.
2. Прывядзіце прыклады подзвігаў воінаў-беларусаў на франтах Вялікай Айчыннай вайны.
3. Чаму 3 ліпеня святкуецца ў Рэспубліцы Беларусь як Дзень Незалежнасці?
4. Пра што сведчыла прыняцце БССР у лік краін — заснавальніц ААН?
5. Падрыхтуйце паведамленне на тэму «Удзел БССР у заснаванні ААН: прызнанне міжнародным супольніцтвам заслуг і страт беларускага народа ў барацьбе з нацызмам» і прэзентуйце яго на ўроку абагульнення па раздзеле III.


Правообладатель Издательский центр БГУ